Купить в Беларуси: http://belveter.by

Нацыянальны інстытут адукацыі

**Кампетэнтнасны падыход**

**Г. Э. Давідоўская**

# Гісторыя Беларусі

**9**

клас

## Выніковыя дыягнастычныя матэрыялы

Дапаможнік для настаўнікаў
устаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

*Рэкамендавана*
*Навукова-метадычнай установай*
*«Нацыянальны інстытут адукацыі»*
*Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Мазыр
«Выснова»
2019

Купить в Беларуси: http://belveter.by

Купить в Беларуси: http://belveter.by

УДК 372.893
ББК 74.263.1
Д13

*Серыя заснавана ў 2018 годзе*

Р э ц э н з е н т ы:
кафедра гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы» (кандыдат педагагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры ***С. В. Паноў***);
настаўнік гісторыі вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 56 г. Мінска» ***П. М. Гламбоцкі***

**Давідоўская, Г. Э.**
Д13 Гісторыя Беларусі. 9 клас. Выніковыя дыягнастычныя матэрыялы : дапам. для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з бел. і рус. мовамі навучання / Г. Э. Давідоўская. — Мазыр : Выснова, 2019. — 63, [1] с. : іл. — (Кампетэнтнасны падыход).
ISBN 978-985-27-0161-7.

Прадстаўлены комплекс выніковых дыягнастычных матэрыялаў ахоплівае ўвесь перыяд вывучэння гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да сучаснасці і дазваляе правесці дыягностыку ўзроўню засваення ведаў і сфарміраванасці спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў за курс вывучэння вучэбнага прадмета «Гісторыя Беларусі» ў 6—9 класах.
Рэкамендуецца настаўнікам гісторыі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

**УДК 372.893**
**ББК 74.263.1**

**ISBN 978-985-27-0161-7**

© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2019
© Афармленне. ТАА «Выдавецтва «Выснова», 2019

Купить в Беларуси: http://belveter.by

# УВОДЗІНЫ

Прадстаўлены комплекс выніковых дыягнастычных матэрыялаў ахоплівае ўвесь перыяд вывучэння гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да сучаснасці і дазваляе правесці дыягностыку узроўню засваення ведаў і сфарміраванасці спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў за курс вывучэння вучэбнага прадмета «Гісторыя Беларусі» ў 6—9 класах.

Дыягнастычныя матэрыялы сканструяваны як заданні па найбольш важных тэмах праграмы. Заданні маюць кампетэнтнасны характар і складзены ў адпаведнасці з праграмнымі патрабаваннямі да вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў.

Кампетэнтнасны падыход у навучанні гісторыі грунтуецца не на механічным запамінанні вызначанага аб'ёму гістарычнай інфармацыі (дат, паняццяў, асоб і падзей), а на фарміраванні ў вучняў вопыту самастойнага рашэння пастаўленых задач на аснове прад'яўлення розных форм інфармацыі, уменні абагульняць і сістэматызаваць гістарычныя факты, устанаўліваць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі, з'явамі, працэсамі і рабіць на гэтай падставе вывады.

Прапанаваныя матэрыялы ўтрымліваюць заданні, накіраваныя на дыягностыку прадметных кампетэнцый, прадугледжаных вучэбнай праграмай:

— вызначаць храналагічную паслядоўнасць вывучаных гістарычных падзей, іх працягласць;
— правільна выкарыстоўваць вывучаныя гістарычныя паняцці;
— працаваць з рознымі формамі прад'яўлення інфармацыі (тэкст, схема, картасхема, гістарычны дакумент і інш.);
— чытаць фрагменты гістарычных дакументаў, выкарыстоўваць іх для характарыстыкі вывучаных гістарычных фактаў, рашэння вучэбных задач;
— выкарыстоўваць гістарычную карту як крыніцу інфармацыі аб гістарычных падзеях, з'явах, працэсах;

— выкарыстоўваць ілюстрацыі, фатаграфіі як крыніцу інфармацыі для характарыстыкі гістарычных падзей, з'яў, асоб;
— устанаўліваць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі, з'явамі, працэсамі;
— канкрэтызаваць гістарычныя паняцці і вывады прыкладамі;
— параўноўваць гістарычныя падзеі і з'явы па самастойна выбраных крытэрыях; выяўляць агульнае і асаблівае, фармуляваць вывады;
— даваць ацэнку вывучаным гістарычным падзеям, з'явам, працэсам, дзейнасці гістарычных асоб, дасягненням матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі ў вывучаны перыяд з пункту гледжання агульначалавечых каштоўнасцей.

Выніковыя дыягнастычныя заданні складзены згодна з 5-узроўневай сістэмай ацэнкі вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, таму пажадана выконваць іх паслядоўна. Да кожнага ўзроўню адносяцца наступныя тыпы заданняў:

***Першы ўзровень***

Распазнаванне гістарычнай падзеі (гістарычнага працэсу) або гістарычнай асобы (дзеяча культуры) з апорай на яго мастацкае адлюстраванне, гістарычны дакумент ці статыстычныя дадзеныя.

***Другі ўзровень***

Пералічэнне асноўных фактаў, звязаных з канкрэтнай гістарычнай асобай ці падзеяй, характэрных рысаў канкрэтнай гістарычнай з'явы.

Вызначэнне і канкрэтызацыя (тлумачэнне) паняццяў і гістарычных назваў, звязаных з гістарычнай падзеяй (гістарычным працэсам) або гістарычнай асобай (дзеячам культуры).

***Трэці ўзровень***

Вызначэнне ключавых слоў пры аналізе зместу гістарычнага дакумента.

Уменне праводзіць аналіз зместу гістарычнага дакумента ў працэсе пошуку неабходнай інфармацыі.

Лакалізацыя гістарычных падзей у геапалітычнай прасторы з апорай на гістарычную карту.

Сістэматызацыя гістарычных фактаў у адпаведнасці з грамадска-гістарычным працэсам.

Параўнанне гістарычных фактаў па прапанаваных прыметах.

Веданне прыведзеных у вучэбнай літаратуры меркаванняў аб гістарычных падзеях.

***Чацвёрты ўзровень***

Устанаўленне і тлумачэнне прычынна-выніковых сувязей паміж гістарычнымі падзеямі.

Параўнанне гістарычных фактаў па самастойна вызначаных прыметах.

Уменне характарызаваць гістарычную падзею (гістарычны працэс) ці гістарычную асобу (культурнага дзеяча) па вызначаным алгарытме.

***Пяты ўзровень***

Рашэнне гістарычнай задачы.

Правядзенне доказу.

Прагназаванне далейшага развіцця гістарычнай падзеі ці гістарычнага працэсу.

Выказванне і аргументаванне ўласных адносін да вывучаемых гістарычных падзей і іх удзельнікаў.

Пералічаныя спосабы дзейнасці, прадстаўленыя ў выніковых дыягнастычных заданнях, адлюстроўваюць не толькі прадметныя вынікі навучання, але і асобасныя, і мэтапрадметныя.

Для зручнасці падліку балаў і вызначэння ўзроўню падрыхтоўкі вучняў можна прапанаваць наступны парадак.

1) Заданне кожнага ўзроўню мэтазгодна ацэньваць адпаведнай колькасцю балаў (табл. 1):

Табліца 1

| № задання | Максімальная колькасць балаў |
|---|---|
| 1 | Да 2 балаў |
| 2 | Да 4 балаў |
| 3 | Да 6 балаў |
| 4 | Да 12 балаў |
| 5 | Да 16 балаў |

## Жыццё і заняткі насельніцтва беларускіх зямель ва ўмовах першабытнага грамадства

**1.** Вызначце назву гаспадаркі старажытных людзей для кожнага малюнка з наступнага спіса і падпішыце яе назву ў правільнай сувязі з малюнкам: ***вытворчая, прысвойвальная, таварна-грашовая.***



А) ____________________________



Б) ____________________________

**2.** Дайце вызначэнне кожнаму тыпу гаспадаркі, якія прадстаўлены на малюнках.

**3.** Параўнайце абедзве гаспадаркі па крытэрыям, вызначаным у першым слупку табліцы.

Купить в Беларуси: http://belveter.by

# ЗМЕСТ

Уводзіны . . . 3
Жыццё і заняткі насельніцтва беларускіх зямель ва ўмовах першабытнага грамадства . . . 7
Рассяленне ўсходнеславянскіх плямён на тэрыторыі Беларусі, жыццё і заняткі насельніцтва ў VIII—IX стст. . . . 9
Утварэнне дзяржаўнасці ў усходніх славян . . . 11
Полацкае княства ў X—XI стст. . . . 12
Развіццё культуры на беларускіх землях у IX — сярэдзіне XIII ст. . . . 14
Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага . . . 15
Умацаванне вялікакняжацкай улады і дзяржаўны лад Вялікага Княства Літоўскага ў канцы XIII—XIV ст. . . . 16
Крэўская ўнія і яе ўплыў на становішча беларускіх зямель . . . 17
Развіццё культуры на беларускіх землях у XIV—XV стст. . . . 19
«Вялікая вайна» і Грунвальдская бітва . . . 20
Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у XIV — сярэдзіне XVI ст. . . . 21
Культура беларускіх зямель у першай палове XVI ст. . . . 22
Аб'яднанне Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы ў складзе Рэчы Паспалітай . . . 23
Развіццё культуры на беларускіх землях у другой палове XVI — першай палове XVII ст. . . . 25
Эканамічнае развіццё Беларусі ў XVI—XVIII стст. . . . 26
Культура Беларусі ў другой палове XVII—XVIII стст. . . . 27
Падзелы Рэчы Паспалітай і іх уплыў на становішча беларускіх зямель 28
Беларусь у час вайны 1812 г. . . . 29
Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў першай палове XIX ст. 30
Адмена прыгоннага права . . . 31
Паўстанне 1863—1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі . . . 33
Сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. . . . 33
Падзеі Першай сусветнай вайны на беларускіх землях . . . 35
Развіццё культуры на беларускіх землях у XIX — пачатку XX ст. . . . 37
Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўсталяванне савецкай улады на Беларусі 38
Абвяшчэнне і стварэнне беларускай дзяржаўнасці . . . 40
Культурнае развіццё БССР у 1920-я гг. і палітыка паланізацыі ў Заходняй Беларусі . . . 41
Беларусь ва ўмовах станаўлення савецкага сацыялістычнага грамадства . . . 43



Купить в Беларуси: http://belveter.by

**2.** Дайце вызначэнне паняццю «рыначная сістэма эканамічных адносін».

**3.** Растлумачце, чаму пасля распаду Савецкага Саюза беларуская эканоміка апынулася ў цяжкім становішчы?

**4.** Прыярытэтным напрамкам развіцця Беларусі вызначана развіццё чалавечага капіталу. Як вы разумееце, што такое чалавечы капітал? Якія мерапрыемствы праводзяцца ў нашай краіне для ажыццяўлення вызначанага накірунку развіцця?

**5.** Выкажыце свае адносіны да перспектыў развіцця нашай краіны ва ўмовах фарміравання інфармацыйнага грамадства.

## Развіццё культуры ў Рэспубліцы Беларусь

**1.** Са спіса вядомых культурных дзеячаў вызначце імя вядомай беларускай пісьменніцы — лаўрэата Нобелеўскай прэміі:

а) В. Корбут; б) Т. Бірыч; в) С. Алексіевіч; г) І. Дарафеева.

**2.** Назавіце не менш 3 найбольш вядомых літаратурных твораў гэтай пісьменніцы.

**3.** Растлумачце, чаму будынак, прадстаўлены на фотаздымку, лічыцца інфармацыйным і культурным цэнтрам Рэспублікі Беларусь.



**4.** На аснове прыкладаў твораў літаратуры і накірунку мастацтва (гл. с. 62) вызначце асноўную тэму, якая раскрывалася ў канцы XX — пачатку XXI ст. Растлумачце, чаму гэта тэма стала вядучай у незалежнай Рэспубліцы Беларусь?

| Аўтар | Твор | Змест |
|---|---|---|
| Л. Дайнека | Раман «Меч князя Вячкі» | Твор прысвечаны гісторыі Полацкага княства пачатку XIII ст., барацьбе з крыжакамі |
| У. Стэльмашонак | Карціна «Слова аб Беларусі» |  |
| А. Дудараў | Тэатральная пастаноўка «Князь Вітаўт» | Спектакль прысвечаны найбольш вядомаму князю Вялікага Княства Літоўскага |
| А. Елізар’еў | Пастаноўка балета «Страсці» («Рагнеда») | Балет прысвечаны лёсу полацкай князёўны Рагнеды |
| Ю. Елхаў | Кінастужка «Анастасія Слуцкая» | Фільм распавядае пра абарону Слуцка ад татараў у XVI ст. |
| А. Фінскі | Помнік букве Ў у Полацку |  |

**5.** Дакажыце, што ў Рэспубліцы Беларусь адбываецца працэс адраджэння гісторыка-культурнай спадчыны. Прывядзіце не менш 5 аргументаў.